**Пагарэлаў, А.** Гарачы жнівень 43-га… / А Пагарэлаў // Віцебскі рабочы. – 1993. – 21 жн. – С. 3.

# ГАРАЧЫ ЖНІВЕНЬ 43-га...

Ішоў жнівень 1943 года. Партызаны з душэўным хваляваннем сачылі за жорсткімі баямі Чырвонай Арміі. У тыя дні адбылася важная падзея, якая ўсхвалявала нас. У час бітвы пад Курскам воіны-беларусы звярнуліся да партызан, усяго народа рэспублікі з заклікам узмацніць барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

7 жніўня на Смаленскім напрамку ў наступленне перайшлі Заходні фронт і частка Калінінскага. Недалёка і Віцебск! Гітлераўскае камандаванне кінула сюды вялікія сілы. Праз 4 дні Гітлер аддаў загад аб тэрміновым будаўніцтве Усходняга вала – стратэгічнага абарончага рубяжа на ўсход ад Віцебска. Так мы апынуліся паміж першай і другой лініямі абароны праціўніка.

У нашым атрадзе, што уваходзіў у састаў Першай Беларускай партызанскай брыгады, які дыслацыраваўся на левым беразе Заходняй Дзвіны (у вузкай паласе лесу ад Рубы да вёскі Рыбакі), у асноўным былі мясцовыя жыхары. Начальнікам разведкі і намеснікам камандзіра атрада быў Рыгор Цімафеевіч Сальчанка з Клішава Суражскага раёна, начальнікам штаба – Пётр Людвігавіч Камароўскі з Буева, памочнікам начальніка штаба – Мікалай Палудзеткін з Палудзетак, намеснікам камісара па камсамолу – Сямён Васільевіч Юпатаў з Андронавіч, начальнікам агентурнай разведкі – Вера Сямёнаўна Кулагіна з Букаціна Бараўлянскага сельсавета, камандзірам узвода разведкі – Даніла Прусаў з Клішава, начальнікам боезабеспячэння – Аляксей Лабоўкін – з Батаніцкага сельсавета, камандзірам разведвальна-пошукавай групы – Іван Андрэевіч Бекішаў – з Віцебска, Радзівон Васільевіч Сухараў – з пасёлка Руба, Міхаіл Магучы – з Прысушына, Алег Шляхто – з Буева, іншыя партызаны з навакольных вёсак Жалезнякі, Максюткі, Курына, Кошалева, Пышнякі, Бялынавічы, Бабінічы, Рыбакі, Жабенцяі, з Суража... У атрадзе былі партызаны і з іншых рэспублік.

Аб расшырэнні баёў з акупантамі мы атрымалі тэлеграму з Беларускага штаба партызанскага руху і прадпісанне падпольных Віцебскага абкома і Суражскага райкома партыі. Дзве групы нашых падрыўнікоў пад кіраўніцтвам камандзіра знішчальнага ўзвода Пятра Антоненкі і намесніка палітрука роты Пятра Анішчанкі, удзельнічаючы ў «рэйкавай вайне», у першай палавіне жніўня на чыгунцы Віцебск – Лёзна ўзарвалі больш трохсот рэек. На дарогах, што вядуць да фронту, на нашых мінах падрываліся танкі і іншая тэхніка. Не давалі спакою гітлераўцам і ў іх гарнізонах. Наша разведвальная і дыверсійная групы, якія разам з падпольшчыкамі налічвалі 21 чалавека, пад кіраўніцтвам В. С. Кулагінай на Віцебскім аэрадроме падарвала самалёт і воданапорную вежу, на чыгуначным вузле каля дэпо вывела са строю толькі што адрамантаваны паравоз. Узрываліся нашы міны і ў іншых месцах, дзе збіраліся захопнікі. Гэта на іх наводзіла страх, дэмаралізавала. Збіраліся і перадаваліся ў штаб брыгады каштоўныя разведданыя аб скапленні тэхнікі і войск ворага ў Віцебску, што давала магчымасць нашай авіяцыі наносіць прыцэльныя ўдары. Беларускі штаб партызанскага руху павялічыў закідку на самалётах нам узрыўчаткі, мін, боепрыпасаў і ўзбраення.

У ноч з 17 на 18 жніўня 1943 года з прыфрантавога Войлаўскага аэрадрома Смаленскай вобласці на 15 самалётах У-2 двума рэйсамі на партызанскі аэрадром недалёка ад Курына быў перакінуты дэсант з 50 добра ўзброеных байцоў пад камандаваннем Аляксандра Сяргеевіча Пятрова.

Атрадная і агентурная разведка дакладвала, што паблізу атрада сканцэнтроўваюцца вялікія сілы ворага. Мы паставілі больш пастоў, узмацнілі баявую ахову. У вузкай паласе лесу працягласцю каля 40 кіламетраў былі ўсяго два невялікія атрады: наш і М. П. Машкова. Праўда, сіл прыбавілася пасля прыбыцця дэсанта Пятрова і дзвюх рот (адна на чале з Іванам Рыгоравічам Салаўёвым з атрада імя Курмялёва ў наш атрад і з атрада Гурко пад камандаваннем Аляксандра Дзямідавіча Махлакова ў атрад Машкова). Усяго налічвалася каля 400 чалавек. Узбраенне было добрае, больш ста аўтаматаў, ручныя кулямёты, прыстасаваныя страляць і з ходу, і стоячы.

Напружанне нарастала з кожным днём, адчувалася, што фашысты хутка рушаць на нас, бой непазбежны. І ў ноч з 23 на 24 жніўня карнікі пачалі наступленне на партызан нашай зоны пад Віцебскам.

На Буеўскіх могілках арганізавалі засаду, дзе пад камандаваннем Р. Ц. Сальчанкі знаходзілася каля роты. І калі гітлераўцы шчыльнай масай падышлі да могілак, быў адкрыты знішчальны агонь. Немцы разгубіліся, пабеглі назад, пакінуўшы на адкрытым полі больш 30 трупаў. Мы адыходзілі ў раён Яшкаўскага возера, за Рыбакамі, дзе лес быў шырэйшы, можна лепш манеўраваць.

У сярэдзіне дня недалёка ад дарогі Белікі – Рыбакі сустрэлі атрад Машкова і Пятрова. Яны адыходзілі з баямі з-пад Суража. Параіўшыся, вырашылі арганізаваць кругавую абарону, і адкуль карнікі падыдуць першымі – туды і прарывацца. Калі з боку Віцебска – то ў Аўдзееўскую пушчу (буйны лясны Масіў паміж Буева і Рубай). Для абароны з боку Віцебска выбралі добрую пазіцыю. Праз лес ішла вузкая дарога і асушальная канава, у яе і заляглі асноўныя сілы партызан.

Праз некаторы час з Белікаў на Рыбакі прайшла вялікая калона немцаў. Праз увесь лес яны пачалі акопвацца байніцамі ў наш бок. Стала ясна, што нямецкі ланцуг, што ідзе з-пад Буева, павінен выцесніць нас на засаду гітлераўцаў, што акапалася.

Напружанне нарастала, карнікі вось-вось выйдуць на палянку перад канавай. Ужо чутны іх крокі, патрэскваюць сучкі і галінкі. Гадзіннік паказваў 17-00. Мы выйгралі час: хутка вечар, а ноч – наша саюзніца. Калі гітлераўцы шчыльным ланцугом, упёршы ў жываты аўтаматы, выйшлі на палянку і аказаліся літаральна ў некалькіх кроках ад нас, прагучалі каманды і раздаўся залп. Партызаны з крыкамі «ура!» кінуліся ўперад. Першы ланцуг быў зламаны. Карнікі валяліся грудамі. У гэтай атацы ў нас быў паранены ў нагу толькі новы камандзір узвода разведкі Сяргей Палудзеткін, а Д. П. Прусава, нядаўна цяжкапараненага, адправілі на самалёце за лінію фронту.

Мы ішлі назад, да Буеўскіх могілак, каб прабіцца ў Аўдзееўскую пушчу. Прарвалі яшчэ тры ланцугі. Бой у лесе даходзіў да рукапашных схватак. Часам наша атака захлёбвалася. У такія моманты камандзіры рот І. Н. Яршоў, Дзмітрый Якунін, Іван Салаўёў, палітрукі рот, мясцовыя камуністы Н. І. Жлоба, С. І. Івашнёў, І. П. Цуранаў, камісар атрада Т. Е. Машкова, Карасёў, яго намеснік па камсамолу Канстанцін Шабанаў, начальнік разведкі Міхаіл Купчанка, камісар дэсанта М. П. Сенакосаў, іншыя па сваёй ініцыятыве смела ішлі на ворага, вялі за сабой партызан. Адважна ішоў ўперадзе разведчыкаў Рыгор Сальчанка, ведучы за сабой астатніх. Часта наша страляніна па карніках вялася ва ўпор. Дым засцілаў лес, па ім насіўся пах крыві. Артылерыя ворага нас не абстрэльвала, паколькі немцы не ведалі, дзе свае, а дзе партызаны. У самых гарачых кропках бою па-геройску загінулі намеснік камандзіра атрада камуніст старшы лейтэнант Рыгор Цімафеевіч Сальчанка, камандзір роты камуніст Іван Рыгоравіч Салаўёў. Смяртэльна параненыя намеснік камісара атрада Канстанцін Андрэевіч Шабанаў, камісар дэсанта Мікалай Пятровіч Сенакосаў і

камандзір падраздзялення дэсанта Ілья Рыгоравіч Капейка падарваліся адной гранатай разам з падышоўшымі карнікамі.

Усяго ў гэтым баі загінула 29 партызан, а праціўнік згубіў у некалькі разоў больш. Мы прабіліся ў Аўдзееўскую пушчу. Адарваліся ад ворага. Камсамольцы Міхаіл Магучы і Іван Варапаеў вынеслі з бою цяжкапараненага свайго баявога сябра Леаніда Кавалеўскага. Большасць загінуўшых партызан мы пахавалі ў брацкай магіле каля Буеўскіх могілак.

Атрад набыў яшчэ большы вопыт, стаў больш згуртаваным і працягваў наносіць адчувальныя страты захопнікам. Многія партызаны былі прадстаўлены да дзяржаўных узнагарод.

У час урачыстых дат ля помніка загінуўшым 24 жніўня 1943 года партызанам у Буева збіраецца насельніцтва навакольных вёсак, гарпасёлка Сураж і Віцебска. Мы памятаем нашых баявых сяброў.

**А. ПАГАРЭЛАЎ,**

**былы камандзір партызанскага атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады**